


Асіпенка, А.
Два дні і дзве ночы : аповесці / А. Асіпенка. - Мінск : Мастацкая літаратура, 1977. - 304 с.




Асіпенка, А.
Жыта : аповесць / А. Асіпенка ; маст. А. Дэмарын. - Мінск : Беларусь, 1968. - 288 с.




Асіпенка, А.
Лабірынты страху : раман / А. Асіпенка ; рэд. А. А. Сляпцова. - Мінск : Мастацкая літ., 1992. - 447 с.




Асіпенка, А.
Парогі : апавяданні / А. Асіпенка. - Мінск : Мастацкая літ., 1973. - 208 с.




Асіпенка, А.
Крокі : выбранае / А. Асіпенка. - Мінск : Беларусь, 1971. - 344 с.




Асіпенка, А.
Знікненне ў барвовай імгле : аповесці (трыпціх) / А. Асіпенка. - Мінск : Мастацкая літ., 1995. - 300 с.




Асіпенка, А.
Збор твораў : у трох тамах / А. Асіпенка. - Мінск : Маст. літ. - ISBN 5-340-00302-7.
Т. 1 : Вогненны азімут : раман. - 1989. - 446 с.




Осипенко, А. Х.
Жито. Обжитый угол / А. Х. Осипенко ; пер. А. Х. Осипенко. - Минск : Мастацкая літ., 1975. - 384 с.

**Бібліятэка ім. Д. Р. Новікава Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі**

# «Алесь Асіпенка – майстар пяра»



**(1919–1994)**

***(105 гадоў з дня нараджэння Алеся Асіпенкі, беларускага пісьменніка)***

**Горкі 2024**



Алесь (Аляксандр Харытонавіч) Асіпенка — пісьменнік, сцэнарыст, Заслужаны работнік культуры Беларусі. Член Саюза пісьменнікаў СССР.

Нарадзіўся 7 верасня 1919 г. ў вёсцы Пушкары Віцебскага раёна ў сялянскай сям'і. Закончыўшы Бабініцкую сямігодку, ён паступае на падрыхтоўчыя курсы ў Віцебскі ветэрынарны інстытут, але не заканчвае іх. Цяжкая хвароба на год прыкавала яго да ложка. У 1937 г. паступае на другі курс Віцебскага педрабфака, а пасля заканчэння — у педагагічны інстытут. Навучэнне ў Віцебскім педагагічным інстытуце Алесь Асіпенка пакінуў з другога курса, пайшоў настаўнічаць. У час Вялікай Айчыннай вайны ваяваў у партызанскім атрадзе №7 брыгады Аляксея Данукалава на Віцебшчыне. У снежні 1942 г. па стане здароўя адпраўлены за лінію фронту. Лячыўся ў шпіталі, вучыўся ў школе партызанскага руху, на партыйна-савецкіх курсах.



Калі ў 1943 г. пачалося вызваленне ўсходніх абласцей Беларусі, Асіпенку як памочніка камісара партызанскага атрада накіроўваюць сакратаром райкома камсамола ў Горацкі, затым Краснапольскі раёны Магілеўскай вобласці. У красавіку 1944 г. ідзе на працу ў газету «Чырвоная змена», спярва карэспандэнтам, літсупрацоўнікам, загадчыкам аддзела, а пасля – намеснікам рэдактара і рэдактарам. У 1955 г. завочна скончыў Мінскі педагагічны інстытут. З 1966 г. – галоўны рэдактар часопіса «Маладосць», з 1972 г. – галоўны рэдактар сцэнарнага аддзела кінастудыі «Беларусьфільм». У 1976-1980 гг. працуе галоўным рэдактарам штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва».



Асноўная тэма твораў — гераізм народа ў барацьбе з фашызмам, партызанскі рух, пасляваеннае аднаўленне, жыццё вёскі і горада, сацыяльныя і маральна-этычныя праблемы. Пісьменнік звяртаўся да праблем сучаснасці, аднак разглядаў іх у цесным спалучэнні з падзеямі гістарычнага мінулага. Сюжэт будаваў займальна, карыстаючыся часта прыгодніцкімі, нават дэтэктыўнымі прыёмамі. Цікава, што ў многіх аповесцях не назіраецца поўнай завершанасці сюжэта. Алесь Асіпенка заўсёды пісаў пра тое, што добра яму вядома, што перажыта, перадумана.

Першае апавяданне надрукаваў у 1945 годзе. Выйшлі ў свет зборнікі апавяданняў і аповесцей «Лёд растае», «Подых кветак і працы», «Дарога ў даль», «Крокі», «Парогі», «Абжыты кут», «Жыта», «Канец бабінага лета», «Два дні і дзве ночы», «Пяцёра адважных», раманы «Непрыкаяны маладзік», «Святыя грэшнікі», «Лабірынты страху».



